Народная Воля
http://www.nv-online.info
17—19 САКАВІКА 2009 г.

ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Народнай Волі»

Выпуск № 2 (28) (сакавік 2009 г.)

З НЕАПУБЛІКАВАНАГА

«Катэгарычна аб'яўляю: я — пісьменнік беларускі»

Гутарка Юрася ЗАЛОСКІ з Васілём БЫКАВЫМ

**Думкі і словы вялікіх людзей не спазняюцца, бо існуюць і ў сваім часе, і па-над ім…
«Ь» прапануе фрагменты неапублікаванай раней размовы з народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым, якія былі запісаны ў чэрвені 1995 г. Цалкам невядомыя тры гутаркі будуць надрукаваныя ў часопісе "Дзеяслоў".**

— Вы доўгі час былі адарваны ад роднай мовы, пачалі пісаць бадай у трыццацігадовым узросце, зразумела, што зрабіць гэта было не так лёгка. На якой мове пачыналі пісаць — па-расійску ці па-беларуску?

— ...Я прыехаў у Гродна з Далёкага Усходу ў 1955 годзе, з кароткім побытам у Лапічах пад Асіповічамі — служыў там некалькі месяцаў. Не было ў мяне, вядома, ні кватэры, нічога не было, я быў нейкі час без работы. Пасля надарылася ў рэдакцыі "Гродзен-скай праўды" пасада карэктара, і мяне туды ўзялі — на беларускае выданне (газета тады выходзіла на дзвюх мовах — па-руску і па-беларуску, на беларускую мову дублявалі, здаецца, 800 асобнікаў). Я пайшоў карэктарам беларускага выдання. Папрацаваў там некалькі месяцаў, пасля перайшоў у сакратарыят... Так што ў мяне папросту не было патрэбы карыстацца расійскай мовай, бо ўвесь час працаваў з беларускай мовай. Першыя апавяданні, якія напісаў, а затым надрукаваў, былі, канечне, беларускія.

Затым ужо для патрэбы самапераклада мне давялося авалодваць і расійскай літаратурнай мовай. Гэта быў вельмі складаны працэс, і пераклады, каторыя рабіў пазней, нават апошнія, — вымагалі каласальнай працы. Вось што значыць няродная мова...

— Што вас прымусіла рабіць пераклады?

— Я таму звярнуўся да расійскай мовы, і сам пачаў перакладаць, што пераклады ўсіх прафесійных перакладчыкаў мяне не задавальнялі, бо яны былі проста слабымі ў моўных адносінах. Я гэта рабіў лепш.

— А як тэхнічна гэта выглядае?

— Калі перакладаю на расійскую мову, то некаторыя старонкі перадрукоўваю па сем разоў, бо да чарнаты праўкі даходзяць, і трэба перадрукоўваць, бо разабраць немагчыма. Вось такая гэта праца — пераклад на расійскую мову. Я з гэтага зрабіў выснову, што як бы я ні валодаў беларускай мовай, але ўсё-такі — гэта родная мова, і тым усё сказана... Стаць расійскамоўным пісьменнікам я не магу, мабыць, наканавана быць пісьменнікам беларускім.

— Аднак жа дзякуючы расійскім перакладам сусветная чытацкая аўдыторыя прызвычаілася да таго, што вы — рускамоўны аўтар, расійскі пісь-меннік — Васіль Быкаў…

— Такое ёсць, часам мяне называюць "дзвюхмоўным" пісьменнікам. Дык вось, я заўсёды ў такіх выпадках, калі мяне аб гэтым пытаюць, катэгарычна аб'яўляю, што я — пісьменнік беларускі, толькі такі... Раней гэта было важна — расійскі пераклад. Хоць бы таму, што амаль усе мае пераклады на замежныя мовы зроблены з яго, і таму я вельмі адказна ставіўся да гэтай работы...

— Зараз літаратура, па вашых словах, як бы стаптана самім жыццём. Які ж яе лёс — літаратуры? Ці захавае яна, на вашу думку, нейкую вагу ў грамадстве?

— Літаратура знікае. І не толькі ў нас. Яна знікае ва ўсім свеце...

— Незалежна ад суб'ектыўнай волі творцы?

— Літаратура ў яе звычайным разуменні. На Захадзе ж кніга перастала быць таварам — я маю на ўвазе мастацкую кнігу. Калі там ёсць якія-небудзь літаратурныя шэдэўры, то гэта, па-першае, вельмі элітарная літаратура, а па-другое, гэта літаратура маскульту, шырпатрэб, кітч; гэта аднадзёнкі, разлічаныя на нейкую сенсацыю, з нейкага поваду. Гэта не тая літаратура, да якой прывыклі мы і каторая існавала даволі працяглы гістарычны час, — рэалістычная літаратура. Гэта на Захадзе. А ў нас — бачыце, што робіцца...

— Нешта вы ўспрымаеце са спроб маладога пакалення ў беларускай літаратуры?

— Чаму ж не? Я назіраю, што маладое пакаленне літаратараў прыходзіць у літаратуру куды больш дасведчаным і таленавітым, чым гэта было ў наш час, гэта безумоўна, безумоўна... Я бачу, што каб яно, гэтае пакаленне, працавала ў рэалістычнай літаратуры, то, відаць, гэта было б нават здорава... На жаль, я кепска ўспрымаю авангард, мадэрнізм, постмадэрнізм — і ў выяўленчым мастацтве, і ў літаратуры; я усё-такі болей схільны шанаваць рэалізм. Але я думаю, што задаткі ў маладых ёсць, ёсць розум, талент... Усё можа быць, Божа мой, усё вельмі ўмоўна, розныя плыні мастацкія, літаратурныя змяняюцца, сыходзяць, усё гэта павінна быць, і гэта ўсё натуральна. Ну але мне гэта не цікава — сюррэалістычныя, фантастычныя, прыгодніцкія рэчы, дэтэктывы, для мяне такая літаратура не мае ніякай цікавасці. Я ўсё-такі прытрымліваюся старамоднай, запляванай канцэпцыі "няставага Вісарыёна", які некалі напісаў: "сацыяльнасць альбо смерць". <...>

— На вашу думку, старая формула "змест супадае з формай" — справядлівая?

— Так, безумоўна.

— Мяне ўразіла, што вы заўсёды ведаеце, чым скончыцца твор. Ці значыць гэта, што вы, перад тым як сесці за стол, "выношваеце" твор?

— Гэта натуральна. Гэта хіба ў шматтомных эпа-пеях, над каторымі ідзе доўгая, шматгадовая праца, у працэсе якой мяняюцца не толькі сюжэт і характары герояў, але і светапогляд самога аўтара, нельга нешта прадвызначыць. Калі я пачынаю пісаць твор, то ведаю яго канец.

— Гэта падобна на тое, як пішацца паэзія: верш нараджаецца "ўнутрана" і затым адно заносіцца на паперу.

— Гэтак жа і ў навелістыцы, кароткай прозе.

— Дарэчы, ці захапляецеся паэзіяй, можа, спрабавалі пісаць вершы?

— Не, паэзіяй я не захапляўся. Я люблю кароткія празаічныя рэчы. Для мяне ідэальны верш — тры страфы. Вот чаму, напрыклад, я лічу, што ідэальны гімн для Беларусі — "Магутны Божа". Доўгія рэчы я не люблю. Выключэнне хіба толькі "Новая Зямля" Коласа, хоць яе прыцягальнасць, можа быць, не столькі ад паэзіі, колькі ад іншага чагось... У паэзіі і прозе для мяне вельмі важны лаканізм. Ёсць дзве сучасныя школы прозы — нямецкая і французская. Першая, нямецкая, вызначаецца незвычайным шматслоўем; вялікім лаканізмам — другая, французская. Я бачу, што апошнім часам у нас знайшла перайманне нямецкая школа прозы. Пішуць падрабязна і вельмі доўга. І ў нас, і ў расійскай літаратуры таксама...

— Раней вы распавялі пра жахлівую "кадэбізацыю" савецкага грамадства, абумоўленую ёй праблематычнасць дэмакратызацыі. Няцяжка дапусціць, што не былі абыдзены ўвагай "ворганаў" і вы, пісьменнік з немалым маральным аўтарытэтам у грамадстве. Ці спазналі вы, Васіль Уладзіміравіч, спробы КДБ "залучыць" вас?

— Вядома ж, спазнаў. Уся справа ў тым, што я жыў у Гродне. Усё-такі Гродна — невялікі горад, у параўнанні з Мінскам, і там усе адзін аднаго ведалі, я бачыў, як гэта рабілася...

Канечне ж, спробы паўздзейнічаць на мяне былі, прычым — увесь час. Мяне туды выклікалі, каля мяне хадзілі падпалкоўнікі з КДБ, са мной вялі "работу". Раз-пораз выклікалі сюды, у Мінск, на "прафілактыку", і я прыязджаў... Толькі пасля зразумеў, што ездзіў на тую "прафілактыку" за свае грошы!.. (самаіранічна смяецца). Да мяне званіў падпалкоўнік з КДБ і пытаўся: "Васіль Уладзіміравіч, вы не збіраецеся ў Мінск?" — "Не, не збіраюся". — "Але скора пленум Саюза пісьменнікаў, вы ж паедзеце, мабыць?" — "На пленум паеду". — "Дык вы, калі ласка, вялікая просьба, зайдзіце ў КДБ, там генерал Р., вельмі просіць зайсці".

І вось я прыехаў, прыйшоў у КДБ, праз парадны... Генерал Р. меў са мной гутарку. Тая гутарка была даволі "змястоўная", як цяпер разумею (іранічна ўсміхаецца), але ўвогуле, калі яе асэнсаваць, дык гэта была звачайная "прафілактыка". Канечне ж, не ў мэтах вярбоўкі, а для таго, каб паўплываць на мяне і маю творчасць. Там былі і пагрозы. Вельмі страшныя пагрозы...

— Напрыклад?

— Напрыклад, той генерал Р. расказаў, як у часе вайны дзесь на Палессі расправіліся з адным начальнікам паліцыі па прозвішчы Быкаў... Гэта было маляўніча расказана, як ён умазаў таму з маўзера, і ў таго — мазгі па сцяне... Я думаў, ну добра, дапусцім, такі выпадак быў, але — навошта было паведамляць, што яго прозвішча Быкаў?

— Гэта была псіхалагічная апрацоўка?

— Амаль усе выпускнікі універсітэтаў і ВНУ праз гэтае сіта праходзілі, і з усіх бралі падпіску аб супрацоўніцтве. Дзяліцца гэтым з іншымі было непрыстойна. На тым і будавалася ўся сістэма. Тыя, хто даваў падпіску, не значыць, што яны даносілі. Але яны знаходзіліся ў рэзерве і ў кожны момант маглі зрабіць тое, што было трэба КДБ.

Я памятаю, мне аднойчы, ужо ў наш час, гады два-тры таму даводзілася выступаць на адной аўдыторыі. Я неяк адважыўся сказаць пра ролю КДБ у грамадстве (тады пра гэта нічога нідзе не гаварылася). Нешта мяне падштурхнула да таго, і я не стрымаўся, пачаў казаць з трыбуны, перад аўдыторыяй у чалавек трыста. Мяне там прымалі хораша, добразычліва, і я падумаў, што калі я ім гэта выкладу, то мяне калі не вынесуць на руках, то, прынамсі, апладысменты раздадуцца бурныя. І што — усе павесілі галовы падчас таго расповеду, ніхто не запляскаў. Ніхто, зрэшты, і не запярэчыў, але я ўбачыў, як на маіх вачах апанурылася аўдыторыя. Пасля я сам у сябе запытаўся: "На што ж ты разлічваў? Кожны прымеркаваў гэта да сябе, і ўсім стала няёмка".

Такім было наша грамадства. І ў справе дэмакратызацыі, паўтаруся, нічога не зрушыцца, пакуль не зменяцца пакаленні, пакуль не прыйдуць пакаленні, вольныя ад уплываў спецслужб. Сёння кіраўнікі КДБ кажуць, што яны тым ужо не займаюцца. Але тады ўзнікае пытанне, чым жа яны займаюцца? Здаецца, свае паверхі камерцыйным структурам яны не здавалі... І ходзяць, і шчыруюць, і працуюць, як і раней.

— Наколькі ў такім разуменні савецкай рэчаіснасці, стану рэчаў у грамадстве вам дапамагло знаёмства з жыццём Еўропы, паездкі за мяжу?

— Я ездзіў за мяжу на розныя пісьменніцкія мерапрыемствы, у асноўным гэта былі краіны былога сацлагера, г.зв. СЭУ. Канечне, што-нішто зразумеў. Напрыклад, зразумеў, што пасля перамогі ў 1945 годзе мы прынеслі краінам Усходняй і Цэнтральнай Еўропы новае заняволенне. Я памятаю Балгарыю адразу пасля вайны, я там служыў год у Сафіі. Традыцыйна балгары ставіліся да рускіх вельмі прыязна, хоць Балгарыя і не была на баку антыгітлераўскай кааліцыі, наадварот... Затым я зноў прыехаў у Балгарыю праз дваццаць гадоў, у 1965-м, і што пачуў? Пачуў такі анекдот: "Дзед Тодар працуе ў сваім вінаградніку. Прыбеглі дзеці. Кажуць: "Дзядуля Тодар, дзядуля Тодар, рускія на Месяц паляцелі!". Той устае і кажа: "Што — усе?! Слава табе, Госпадзі!" Вот такія змены. Альбо такі анекдот: "У авіякатастрофе загінулі Эйзенхаўэр, Адэнаўэр і Хрушчоў. Пытанне: які народ больш за усіх гараваць будзе? Адказ: балгарскі. Чаму? — Таму што сярод іх не было Тодара Жыўкава..." У часе паездак высветлілася перш за ўсё вось гэта.

— Ці ўзнікалі ў вас у той час думкі пра эміграцыю?

— Ды не. Па-першае, я быў да таго не гатовы і не думаў пра тое. Мне, прынамсі, пра гэта ніхто не намякаў. Намякалі, наадварот, на фізічную расправу. І такое было, калі нападалі на вуліцах, — крымінальнікі...

— Хто?

— Неяк вечарам мы з Клейнам ішлі па вуліцы, я яго праводзіў. Ля пад'езда яго дома — у цэнтры горада — трохі затрымаліся, заканчваючы размову. І тут на нас наляцелі трое здаровых дзецюкоў. Пачалі біць. Разбілі акуляры і г.д... Прычым — моўчкі. Мы кры-чым: "У чым справа, за што?!" А тыя маўчаць. Потым раптам усе адсыпаліся, адзін паварочваецца і кажа: "Простите, ребята". Усё адразу стала зразумела... У міліцыю, параіўшыся, мы не пайшлі, бо адно толькі згубілі б ноч, пішучы тлумачэнні ...

— На вашу думку, нашае жыццё вызначаць будзе палітыка, а не культура, расійская ці то беларуская?

— Вот іменна. І вызначаць будзе Лубянка, а не Белы дом. Лубянка заўсёды вызначыць. Гэта ж зразумела. І тое Лукашэнка зразумеў, чаму ён пераможа Кебіча яшчэ на тых выбарах. Заўсёды Лубянка перамагала, як бы яна ні называлася. Нават калі гэта быў запасны варыянт...

НАБАЛЕЛАЕ

Як сёння жывецца літаратару "шэраговаму": сціпламу, шчыраму працаўніку? Як яму пішацца? Як ён выдаецца? Як распаўсюджваюцца яго кнігі? Урэшце, з чаго ён жыве?

Аб тым — наша рубрыка "Набалелае". Яе сённяшні госць — Уладзімір СОДАЛЬ, літаратар, літаратуразнавец і краязнавец (аўтар кніг пра Ф.Багушэвіча, В.Дуніна-Марцінкевіча), колішні аўтар літаратурна-асветніцкіх перадач на БТ, а цяпер — "творчы пенсіянер".

Яго расповед — пра ўласныя клопаты і праблемы. Але ці ж толькі ўласныя?

Уладзімір СОДАЛЬ

Мой эксперымент

...Шчасце вечным не бывае. Змяніўся свет, змяніліся і дзяржаўныя стасункі. У дзяржаўныя выдавецтвы, як было раней, доступ мне перакрыты. Я не такі пранырлівы, як іншыя. І не прыстасаванец.

Пачаў выдаваць кніжачкі за свой кошт, на сваю пенсію. Першую з іх — нарыс пра сядзібу Ядвігіна Ш. "Карпілаўка" — дапамаглі выдаць родныя і блізкія: нявестка, сын, жонка. Затым, сваім коштам, выдаў "Святы куточак той фальварак Свіраны" і зборнічак народных досціпаў, жартовак, анекдотаў "Умей слухаць". "Святы куточак..." мне падмог трохі выдаць Чырвоны касцёл, паспрыялі і віленскія беларусы.

Але адно выдаць, а другое — рэалізаваць выдадзенае, каб хаця б вярнуць патрачанае, не зарабіць. Напачатку трэба было пераадолець псіхалагічны бар'ер. Дзе, як, пры якой нагодзе выйсці да людзей са сваімі кніжкамі?

Напачатку паказаўся з імі ў Дом літаратара (калі там яшчэ ладзіліся вечарыны). А дзе ж яшчэ знайду, здавалася, большае разуменне, як не сярод літаратурнай публікі!

Набываць асабліва не набывалі, але і нос не адварочвалі: падыходзілі, глядзелі, гарталі. То і за гэта ўжо дзякуй!

Не раз вытыркаўся я са сваімі кніжкамі і ў нашых літаратурных музеях пры нагодзе розных імпрэзаў. Але эфект быў той самы. Я самотна ссоўваў выданні ў пакунак і, расчараваны, вяртаўся дадому. І пасля доўга не вытыркаўся на людзі...

Больш паспяховыя "вылазкі" былі на розных людных імпрэзах, як, прыкладам, на восеньскім свяце песні на мінскім Бангалоры. І хай не ўсе яны фінансава для мяне былі багатыя, удалыя, але затое якія былі змястоўныя гутаркі!..

Пад Новы год я зноў наважыўся паказацца людзям са сваёй кніжкай жартаў і досціпаў "Умей слухаць". Падумаў: "Гэта якраз вельмі калядная кніжка. Яе і пад ёлку можна пакласці, і за святочным бяседным сталом можа прыдасца..."

І от спачатку прысуседзіўся я каля дзяўчат, якія таргавалі цацачнымі бычкамі ды іншай пераднавагодняй дробяззю... Затым папрасіўся трошкі пастаяць каля праваслаўнай прыхажанкі, якая прапаноўвала разварушанаму мінскаму люду розныя святыя рэквілярыкі. Нарэшце прыстаў да прадаўшчыцы кветак, дапамагаў ёй, а заадно прапаноўваў і сваю кніжку. Але дзе там! Кветкі зрэдку бралі, а на мае прапановы толькі ўсміхаліся: "Мы ўмеем слухаць!". Толькі адна жанчына паспачувала: "Дажыліся! Напішы, выдай і сам прадай яшчэ!"

А людзі ішлі і ішлі. Я ўжо стаяў у метроўскім пераходзе паблізу новай нацыянальнай бібліятэкі. Там ёсць невялічкая кніжная крама. От ля вакенца з надпісам "Художественная литература" я і прыладкаваўся, ды на мяне ніхто не звяртаў увагі...

З тысячнай людской плыні падышоў да мяне адзін малады чалавек і без ваганняў набыў маю кніжку. Я хацеў яму рэшту вярнуць, але ён адмовіўся:

— Хай вам застанецца на новую.

Я пацікавіўся, як яго завуць, хто ён.

— Генадзь, спартсмен...

Падыходзілі да мяне і некалькі міліцыянтаў, цікавіліся, ці маю я дазвол на продаж кніг. А я прачытаў ім свой эпіграф да кніжкі: "Я гарэлкі не п'ю, цыгарэт не смалю, а за тыя грошыкі кніжкі выдаю". Яны заўсміхаліся.

— А кніжкі я не прадаю, — схітраваў я і дадаў сур'ёзна: Гэта ў мяне эксперымент на духоўнасць нашага народу...

Ашчаслівіў мяне і яшчэ адзін спартсмен з Брэста. Вяртаўся на аўто дадому. Прыпыніўся ля газетнага шапіка, а тут я са сваёй "Умей слухаць"... Ён пагартаў і задаволена сказаў:

— А ведаеце, арыгінальны будзе гасцінец пад Новы год!..

...Сёння я гатоў выдаць пяць краязнаўчых кніг: пра знанага археолага А.Снітку, пра Марцінкевічаву Люцінку, пра Кушляны, пра дзеда Талаша ў час апошняй вайны. Аднак... Дзе ўзяць сродкі на тое, дзе знайсці спонсара?!

А можа, я дарэмна драматызую? Людзі проста не ведаюць пра мае кнігі. Але ж як я магу пры нашай небеларускай сітуацыі да іх дайсці? Прапаноўвалі мне свае паслугі і некаторыя мінскія кнігарні, але выніку — аніякага. Хіба толькі аўтар не бачыць чытацкай абыякавасці. Не бачыць, але адчувае яе!..

То як згадаеш пра рэалізацыю — душа вяне. А калі б матэрыяльныя затраты вярталіся, то можна было б і новае выдаваць, і жыць можна было б. Нават і цікава, асабліва калі ты — пенсіянер.

Ад "Ь": Неўзабаве ў выдавецтве "Кнігазбор" з'явіцца новая кніга У.Содаля "Народныя апавяданні".

КНІГАПІС

Быкаўскі збор

Васіль Быкаў. Поўны збор твораў у 14 тамах. — Том 7: Апавяданні; Том 8: Мемуарная проза. — Мінск: ГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў", Масква: Выдавецтва "Время", 2009. — 480 стар. (Т.7); 576 стар. (Т.8). — Наклад 3000 асобнікаў.

Чарговыя два тамы кнігазбору народнага пісьменніка Беларусі (першыя шэсць выйшлі ў 2006-м і 2007 гадах) склалі тэксталагічна вывучаныя і пракамментаваныя апавяданні перыяду 40-х — 70-х гадоў, а таксама ягоныя ўспаміны, напісаныя ў апошнія гады жыцця: "Доўгая дарога дадому" (кананічны тэкст, з аўтарскімі дадаткамі і ўдакладненнямі), "Парадоксы жыцця. Запісы розных гадоў" і

"Пункціры жыцця. Далітаратурная біяграфія".

«Пасланец мужнасці»

Так называецца кніжны збор паэтычных прысвячэнняў у гонар народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава (выдавецтва "Кнігазбор", 2009). Вершаваны вянок сплялі творы 56 паэтаў Беларусі і іншых краін свету, сярод якіх Уладзімір Караткевіч і

Мікола Аўрамчык, Рыгор Барадулін і Еўдакія Лось, Ніл Гілевіч і Алег Лойка, Яўгенія Янішчыц і Зелімха Яндарбі.

Прадмову да кнігі напісаў гродзенец Юрка Голуб, каардынатарам праекта стаў Мікалай Мельнікаў.

Двухтомнік пра Быкава

Выйшаў у свет першы том кнігі "Васіль Быкаў: гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах і лістах". Яе аўтар — журналіст і даследчык Сяргей Шапран.

Народная Воля http://www.nv-online.info
17—19 САКАВІКА 2009 г.

ЛІТПРАСТОРА

«Аўдыёкніга мае культурніцкае і ідэалагічнае значэнне»

Першая аўдыёкніга на беларускай мове нарадзілася ўсяго чатыры гады таму. Гэта былі... беларускія народныя казкі. Калі толькі пачалі з'яўляцца аўдыёкнігі на роднай мове, кожная заслухоўвалася "да дзірак"... Цяпер маем цэлую паліцу кніг-дыскаў. З класікі: вершы Максіма Багдановіча, вершы і паэмы Янкі Купалы, паэмы Якуба Коласа "Сымон-музыка" і "Новая Зямля", раманы Івана Мележа "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы", вершы і раман "Каласы пад сярпом тваім" Уладзіміра Караткевіча, аповесць Вольгі Іпатавай "Прадслава". З дзіцячай літаратуры: "Беларускія народныя казкі", два дыскі з казкамі Ганса Хрысціяна Андэрсена. Аматары замежнай літаратуры ў аўдыёфармаце могуць паслухаць раман "1984" і казку-алегорыю "Ферма" Джорджа Оруэла. Серыя "Голас сучаснага паэта" прадстаўленая пакуль што дзвюма аўдыёкнігамі: вершамі Уладзіміра Някляева і Ніла Гілевіча... Агулам, каля 30 дыскаў...



Пра гісторыю заснавання кампаніі па стварэнні аўдыёдыскаў "БелТонМедыа", а таксама пра планы кампаніі распавёў яе дырэктар **Алесь КАЛОШ**А:

— Чаму я вырашыў стварыць уласную гуказапісваючую кампанію? У свеце рынак аўдыёкніг актыўна пашыраецца. Калі мы возьмем нашу суседку Расію, то там знойдзем кнігі на ўсе густы: ад Ніцшэ да Марынінай. А ў нас гэтага рынку не было. На маю думку, вельмі важна, што дзякуючы аўдыёкнігам гучыць нашая мова. У гэтым сэнсе аўдыёкніга мае культурніцкае і ідэалагічнае значэнне. ...Неяк да мяне прыйшоў рэжысёр Валер Мазынскі, паслухаў "Беларускія народныя казкі" і стаў адным з ініцыятараў стварэння кампаніі...

Што да дзейнасці... Найперш мы хочам агучыць школьную праграму. Таксама імкнёмся запісаць тых пісьменнікаў, якія найбольш ярка выражаюць беларускую нацыянальную ідэю. Акрамя гэтага, вельмі хочам выдаваць замежную літаратуру на беларускай мове. І яшчэ адзін вялікі напрамак —дзіцячая літаратура. Пачала выходзіць серыя "Казачныя скарбы". У адрозненне ад відэа, гэта той медыяпрадукт, які будзіць у дзіцяці ўяўленне, фантазію...

— Вы аддаяце перавагу акцёрам ці аўтарам пры агучванні тэкстаў?

— Няхай кожны аўтар прачытае адну сваю кніжку для запісу. Гэта істотна, бо голас застанецца ў гісторыі. Яшчэ заўсёды цікава, як аўтар успрымае, як ён перадае свой тэкст. Але ўсё ж мы хочам, каб кнігі начытваў прафесійны акцёр. У нас толькі адно выключэнне — Уладзімір Арлоў, які начытаў цэлую серыю сваіх кніг: "Час чумы", "Таямніцы полацкай гісторыі", "Адкуль наш род", "Ордэн белай мышы", "Сны імператара", "Паром праз Ла-Манш", "Паўстанцы".

У нас ёсць серыя "Голас паэта", якая задумвалася спецыяльна для таго, каб чыталі вершы толькі паэты. Ужо выдадзеныя аўдыёкнігі з вершамі Уладзіміра Някляева, Ніла Гілевіча. Думаем запісаць Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, а таксама маладых паэтаў.

— Як ажыццяўляецца распаўсюджванне вашай прадукцыі?

— Аўдыёкнігі прадаюцца ў кнігарнях "Белкнігі", у дыскарнях. На жаль, пакуль не вельмі добра наладжана сетка распаўсюджвання па рэгіёнах. І яшчэ адзін варыянт распаўсюджвання — праз пошту, які забяспечвае Алесь Яўдаха праз сайт *www.knihi.net*. Большым попытам карыстаецца класіка, а не сучаснасць, проза, а не паэзія.

Ася ПАПЛАЎСКАЯ.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!

Ці можа Чаргінец замяніць Мележа?

Нязграбнасці ды алагічнасць школьных рэформаў настолькі відавочныя, што іх нават няма патрэбы каментаваць. Так, тыя вучні, якія скончылі 9-я класы 12-годкі, цяпер навучаюцца... зноў у 9-х, але нібыта 11-годкі. Тыя ж, хто летась скончыў 8-мы і 10-ты па праграме 12-гадовай школы, сёлета навучаюцца ў 9-м і 10-м класах з пазнакай "штрых" (настаўнікі называюць такія класы "штрыхамі") і мусяць за адзін навучальны год прайсці двухгадовую праграму ды яшчэ і за ўдвая карацейшы тэрмін (напрыклад, 35 гадзін па літаратурах замест ранейшых 72-х). У звычайных класах курс праходжання літаратур скараціўся да 53-х гадзін. У выніку маем два выпускі — 11 і 11' з, мякка кажучы, нераўназначнымі шанцамі на паступленне ў ВНУ. Нонсенс? Трызненне?.. Больш за тое, у некаторых школах гімназічнага тыпу сітуацыя зусім "вясёлая". Тут ёсць і 11, і 11', і так званыя эксперыментальныя класы 12-гадовага навучання. Такім чынам, сёлета там будзе ажно тры выпускі!

Плакаць хочацца, калі падумаеш пра веды сённяшніх школьнікаў. Асабліва па гуманітарных прадметах. У другім паўгоддзі, напрыклад, ва ўсіх класах са скарочанай праграмай адводзіцца ўсяго адна гадзіна на тыдзень для заняткаў літаратурамі — г. зн. удвая менш, чым раней (сімвалічна, што і наклады свежых праграм па літаратурах паменшыліся ўдвая).

Літаратура ў школе нагадвае сёння Грынаўскія рамантычныя пунсовыя ветразі, патрапаныя і парваныя ідэалагізатарскімі ды квазіметадычнымі вятрамі. Так, тыя ветразі — на вокладцы падручніка "Руская літаратура. 8 клас. Часть 2" (выдадзены Нацыянальным інстытутам адукацыі, аўтар-складальнік Л.К.Пятроўская, рэцэнзент доктар навук, прафесар БДУ А.Н.Андрэеў). Пад той вокладкай паміж Горкім, Грынам і Твардоўскім — Антуан дэ Сент-Экзюперы. Без пазнакаў, што ён — не рускі творца, і што ягоны "Маленькі прынц" падаецца ў перакладзе...

Вострай праблемай, якая хвалюе настаўнікаў і бацькоў, з'яўляецца недахоп падручнікаў, паколькі розным класам даводзіцца паралельна займацца па блізкіх праграмах, тады як адзін камплект падручнікаў трэба дзяліць між усімі. Спісаныя падручнікі дзесяцігадовай даўніны ў гэтым выпадку яшчэ вельмі добрае выйсце. На сайце Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі (www.adu.by) выкладзены электронныя версіі падручнікаў па праблемных курсах, адкуль прапанавалася іх пампаваць у выпадку недахопу і раздрукоўваць сваімі сіламі альбо карыстацца "электроннымі падручнікамі".

Каментары прадстаўнікоў афіцыйнага боку на пачатку навучальнага года мелі прыблізна такі характар: ну вы ж разумееце, трэба трошкі патрываць і да т. п. Праблема часткова прызнавалася, але, як казаў дырэктар НІА Генадзь Пальчык, *"тое, што падручнікаў хопіць, я магу казаць гарантавана, але можа ўзнікнуць блытаніна. Магчыма, трэба будзе размяркоўваць падручнікі паміж суседнімі школамі"*. На праўдзе ж, і дасюль падручнікаў як не было, так і няма (і гэта нягледзячы на тое, што бацькі за іх плацяць), а настаўнікам папросту забараняецца рапартаваць пра нястачу вучэбных матэрыялаў. Дарэчы, падручнікаў у аднолькавай ступені бракуе як рэгіянальным, так і мінскім школам.

Праілюстраваць існы стан рэчаў можна выказваннем аднаго настаўніка з форума сайта НІА, што датуецца снежнем 2008 г.: *"прапанова міністра адукацыі "выкарыстоўваць электронную версію" альбо "адміністрацыя ўстановы адукацыі павінна памножыць вучэбныя дапаможнікі, якіх нестае" для нашага раёна, невыканальная. На жнівеньскіх нарадах мы выйшлі з прапановай адкарэктаваць каляндарна-тэматычнае планаванне па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі ў 9 і 9' класах такім чынам, каб усім навучэнцам хапіла падручнікаў (так, напрыклад, у 9-м класе 1-ю і 3-ю чвэрці праходзіць гісторыю Беларусі, а ў 2-й, 4-й чвэрцях — сусветную гісторыю), аднак рабіць нам гэта катэгарычна забаранілі!!!"* Вось вам і пацвярджэнне слоў Радзькова: *"Я зразумеў, што пры пераходзе на 11-гадовае навучанне вострых праблем у нас не адзначаецца"*.

Каб з першых вуснаў даведацца пра тое, якія цяжкасці даводзіцца пераадольваць педагогам, я сустрэлася з настаўнікамі беларускай і рускай моў і літаратур, якія, каб не страціць працу, пажадалі застацца неназванымі. Малады настаўнік-беларусіст, нядаўні выпускнік філфака, распавядае:

"Гэтыя школьныя праграмы — чысты фармалізм. Іх ніхто насамрэч не прытрымліваецца і блізка, бо яны страшэнна далёкія ад рэчаіснасці. Кожны настаўнік вырашае на свой густ, які твор разглядаць (балазе, і ў саміх праграмах маюцца зносачкі — "на выбар настаўніка"). Як вынік — поўны гармідар! Напрыклад, асабіста я пры вывучэнні тэмы "Беларуская літаратура другой паловы XX ст.", на якую ў 11-м "штрыху" адводзіцца дзевяць гадзін, праводжу адзін аглядны занятак па ўсім гэтым часе — каб хоць імёны класікаў прагучалі, а ўвесь астатні час прысвячаю "Людзям на балоце" (на якіх паводле праграмы адводзіцца тры гадзіны). Адпаведна ні "Знак бяды" (2 гадз.), ні "Каласы пад сярпом тваім" (3 гадз.) нават не кранаем, бо тое будзе пустая трата часу. Хоць бы Мележа з ліхам напалам агораць. Дарэчы, у праграме звычайнага 10-га класа, якая будзе дзейнічаць з наступнага года, на ўсяго Караткевіча адводзіцца смешныя 6 гадзін — а гэта і "Каласы...", і "Дзікае паляванне", і "Чазенія". Словам, круціся як хочаш. Я ўжо не кажу пра нейкі кантэкст "сусветнага мастацтва"... Наогул навучальны працэс па гуманітарных прадметах набывае цалкам умоўны сімвалічны характар.

Калі ж я спрабую абмяркоўваць цяжкасці выкладання са школьным кіраўніцтвам, даводзячы маразматычнасць таго, што адбываецца, мне адказваюць, што нікога сілком не трымаюць. Не падабаецца — шукай іншую працу".

А вось што распавяла настаўніца рускай літаратуры адной рэгіянальнай школы:

"Мы проста ў роспачы. На адной з традыцыйных сустрэч з прадстаўнікамі НІА я агучыла блюзнерскую, але не толькі маю думку. Чым вывучаць "Вайну і мір" 4 гадзіны, як гэта прапаноўвае праграма для 11' (замест ранейшых 15-ці!), лепш гэты твор наогул не вывучаць... На агляд паэзіі срэбнага веку альбо літаратуры 1920 — 30-х гг. адводзіцца па адной гадзіне. "Злачынства і пакаранне" — 3 гадзіны. І так што ні вазьмі. Уся замежная літаратура (ад Шэкспіра да Хэмінгуэя) пераведзена ў разрад "для дадатковага чытання". Затое побач з Ахмадулінай, Бродскім, Кузняцовым, Пялевіным, Горыным і Акуніным у адным тэматычным блоку з'явіўся раздзел "рускамоўная літаратура Беларусі", прадстаўлены "выдатнымі майстрамі пяра" (мала каму ў рускамоўным свеце вядомымі) Аўруціным, Чаргінцом, Паліканінай і іншымі.

Я настаўніца з больш як дваццацігадовым стажам, і запэўніваю, што навідавоку татальная дэградацыя інтэлектуальных і духоўных каштоўнасцяў моладзі. Паслухайце, якім прымітыўным, камедзіклабаўскім наваязам размаўляюць дзеці. Раней за ненарматыўную лексіку выключалі з ВНУ, а сёння на нашых вачах яна становіцца ледзь не нормай...

Няўжо гэта робіцца наўмысна, каб прасцей было кіраваць "маўкліва-паслухмянай большасцю"? А метадысты, якія таксама шакаваныя гэтай сітуацыяй, нам адказваюць, што там, наверсе, сядзяць матэматыкі. Яны і вырашаюць..."

Дазволю сабе пракаментаваць апошнія словы шаноўнай настаўніцы. "Логіка" тых (ці таго?), хто "наверсе", зразумелая. Для іх літаратура ды гісторыя — баласт. Ці чыталі яны самі хоць бы ў школе тых жа Дастаеўскага, Чэхава, Айтматава альбо Чорнага, Караткевіча, Быкава?

Дык хто ж суддзі? Хто прымае рашэнні? Пра гэта можна толькі здагадвацца. Прынамсі, калі на другой старонцы тытула ў праграме па рускай літаратуры 2003 г. выдання ў ліку ўкладальнікаў значацца прозвішчы Каратай, Мушынскай, Первазнай, то ў праграме 2008 г. гэтая графа — "праграму падрыхтавалі" — папросту адсутнічае. Гэтак жа і з праграмай па беларускай літаратуры. Пасаромеліся нават назвацца?..

Зрэшты, прозвішчы складальнікаў праграм не таямніца, але, натуральна, што не метадысты, не шараговыя выканаўцы ад НІА вінаватыя ў той сітуацыі, якую мы з прыкрасцю назіраем. Людзям, якім даводзіцца ўладкоўваць школьныя курсы пад гадзіны, "спушчаныя" Адміністрацыяй прэзідэнта, можна толькі паспачуваць. Тое, што адбываецца, — вынік мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыкі. Напаўп'янымі (ці напаўцвярозымі), гэтак жа як і напаўпісьменнымі, кіраваць прасцей. Але літаратура з часоў Дастаеўскага нястомна вучыць: злачынства падразумявае пакаранне. Няхай знішчальнікі беларушчыны на тое не забываюцца...

Таццяна МЯДЗВЕДЗЕВА.

ПАДЗЕІ

«Сибирские огни» засвяціліся па-беларуску

Але ад іх схаваліся амбасадарскія чыноўнікі

"Унікальны праект", "нечуваная падзея", "шматабяцальны пачатак"... Такімі эпітэтамі суправаджалася прэзентацыя незвычайнага нумара расійскага літаратурна-мастацкага часопіса "Сибирские огни", які цалкам быў прысвечаны творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

"Сибирские огни" — найстарэйшае ў Расіі літаратурнае выданне. У розныя гады ў часопісе публікавалі свае творы Васіль Шукшын, Валянцін Распуцін, Віктар Астаф'еў. А сёлетні лютаўскі нумар склалі беларускія вершы і проза.

Напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы ў маскоўскім Доме рускага замежжа на Таганцы адбылася прэзентацыя часопіса з удзелам расійскіх і беларускіх літаратараў, а таксама прадстаўнікоў інтэлігенцыі Масквы. З беларускага боку ўдзельнічалі пісьменнікі, чые творы змешчаныя ў часопісе: Алесь Пашкевіч (апублікаваны перакład яго рамана "Плац волі"), Барыс Пятровіч (аповесць "Путина"), Уладзімір Някляеў, Андрэй Хадановіч (эсэ "Торговцы воздухом"), Сяржук Сыс, Сяргей Трахімёнак, беларус па паходжанні Ілля Расолаў. Шэраг жа прадстаўленых у часопісе аўтараў значна шырэйшы: паэты Уладзімір Арлоў, Галіна Булыка, Генадзь Бураўкін, Алесь Каско, Наста Кудасава, Ніна Мацяш, Алесь Разанаў, Віталь Рыжкоў, Міхась Скобла, Лера Сом, Віктар Ярац.

Чаму менавіта "Сибирские огни" спрычыніліся да папулярызацыі беларускай культуры? Сібірская зямля аднолькава дарагая для многіх славянскіх народаў, дарагая ў розных сэнсах: сюды высылаліся беларусы і прадстаўнікі іншых народаў падчас царызму. Тут знайшлі свой вечны спачын тысячы ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Сюды кіраваліся многія беларусы ў пошуках рамантыкі. Можа яшчэ і таму выступоўцам, што прамаўлялі па-беларуску, перакладчыкі былі не патрэбныя — іх добра разумелі ўсе.

У прэзентацыі бралі ўдзел вядомыя расійскія літаратурныя крытыкі і навукоўцы: рэктар Маскоўскага Літінстытута Барыс Тарасаў, прафесар Ала Бальшакова, сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі празаік Мікалай Дарашэнка; рэдактар часопіса "Дети Ра" Яўгеній Сцяпанаў; паэты Бахыт Кінжэеў і Пятро Кошаль, прадстаўнікі студэнцкай супольнасці. Музычным упрыгожваннем сустрэчы стала выступленне беларускага барда Віктара Шалкевіча.

Перакладчыцкі праект стаў магчымым дзякуючы рупнасці галоўнага рэдактара часопіса Уладзіміра Беразева і члена рэдкалегіі Валерыя Казакова, які напісаў уступны артыкул да нумара, а ў сваім выступленні на прэзентацыі адзначыў: "Прэзентацыя "беларускага" нумара — першая з серыі творчых акцый, якую далей працягнуць украінскі, польскі, сербскі, балгарскі, чэшскі нумары часопіса".

Прыкра, што вечарына, якую напярэдадні анансавалі афіцыйныя СМІ разам з агенцтвам БЕЛТА, беларускія дзяржаўныя выданні ды прадстаўнікі амбасады Беларусі ў Маскве праігнаравалі. Прычына — наяўнасць у часопісе для чынавенства "апазіцыйна настроеных" аўтараў. Аднак відавочна, што сёння найбольшымі апазіцыянерамі ўладзе робяцца самі чыноўнікі ад культуры і ідэалогіі. Як і ў мінулыя часы, іх першы клопат — "не пушчаць" ды забараняць, а не аб'ядноўваць ды ствараць. А ім, беларускім будаўнікам Саюзнай дзяржавы, карысна было б паглядзець, у прыватнасці, з якой павагай і любоўю нашымі ўсходнімі суседзямі збіраюцца па ўсім свеце неацэнныя макулінкі замежнай-эміграцкай духоўнай і культурнай спадчыны — без падзелаў на светлае і цёмнае, чырвонае і белае. Збіраюцца ў аграмадным будынку Дома рускага замежжа ў цэнтры Масквы, дзе ў той дзень беларусы не пачуваліся замежнікамі.

С.СОЖ.

Вядучы вечарыны празаік і публіцыст Валерый Казакоў.

АФІЦЫЙНА

З'езд МСПС

У Маскве нядаўна прайшоў чарговы VII справаздачна-выбарны з'езд Міжнароднай супольнасці пісьменніцкіх саюзаў, які аб'ядноўвае 62 арганізацыі літаратараў. У форуме прынялі ўдзел шэсць дэлегатаў Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Намеснікам старшыні выканкама Міжнароднай супольнасці пісьменніцкіх саюзаў абраны старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў **Алесь ПАШКЕВІЧ**.

Нас запрасілі

У шведскім горадзе Вісбу на выспе Готланд адбылася Асамблея Балтыйскай пісьменніцкай рады — Міжнароднага аб'яднання пісьменніцкіх саюзаў Балтыйскіх краін (Нарвегіі, Даніі, Швецыі, Фінляндыі, Польшчы, Эстоніі, Латвіі, Літвы і Расіі).

Старэйшая пісьменніцкая арганізацыя Беларусі — Саюз беларускіх пісьменнікаў (СБП) — атрымала афіцыйную прапанову стаць паўнапраўным сябрам гэтай міжнароднай асацыяцыі прыбалтыйскіх пісьменніцкіх саюзаў.

Ул. інф.

«Алергія» Пятра Васючэнкі

Калі на першым курсе я слухала лекцыі Пятра Васючэнкі, нават падумаць не магла, што праз два гады буду пісаць рэцэнзіі на яго кнігі, і замест таго, каб ісці на лекцыю па рускай літаратуры, спяшацца на прэзентацыю, прымеркаваную да 50-годдзя пісьменніка...

У Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, дзе адбывалася прэзентацыя кнігі "Ад тэкста да хранатопа", Пятро Васючэнка прызнаўся, што яго хутка адолее алергія на самога сябе — ад той павышанай увагі, якая абрынулася на яго апошнімі днямі... Таму ён выказаў сціплую прапанову прысвяціць вечар гутарцы пра беларускую літаратуру XXI стагоддзя. Але выступоўцы пайшлі сваім шляхам: віншавалі Пятра Васільевіча з юбілеем, з новай кнігай, жадалі далейшага паспяховага творчага лёсу. Уладзімір Гніламёдаў перарваў сябе на паўсказе, запытаўшы ў Пятра Васільевіча: *"Табе падабаецца, што я гавару?.."*, а Ганна Кісліцына ўзгадала скаргу Пятра Васючэнкі на магчымую хуткую алергію і вырашыла пашкадаваць юбіляра ды распавяла пра сябе... Дакладней, пра тое, як пазнаёмілася з пісьменнікам...

Нягледзячы на тое, што кніга прэзентавалася сур'ёзная, літаратуразнаўчая, прэзентацыя праходзіла вельмі разняволена. Міхась Тычына пасля згадкі пра смачную капусту, якой частавала яго маці Пятра Васючэнкі, скончыў выступ ягоным вершам "Паэты": "Дзеля чаго жывуць паэты? // Жывуць... І дзякуй ім за гэта".

Ася ПАПЛАЎСКАЯ.
Фота аўтара.

ПАЭЗІЯ

Генадзь ПРАНЕВІЧ

Гэтую нізку вершаў доктара філалагічных навук брэстаўчаніна Генадзя ПРАНЕВІЧА летась перадала ў "Літаратурную Беларусь" са сваімі цёплымі водгукамі светлай памяці Ніна Мацяш.

Разам з рэкамендацыяй на ўступленне ў Саюз беларускіх пісьменнікаў...

Апошняя радасць

***

Стаю, галавой пахіліўшыся,
як пераспелы сланечнік.
Пара на зямлю мне
зярнятамі думак гарачых праліцца.
Пільна сочачы круг свой,
за сонцам спяшацца ў вечнасць,
Анічога не ўзяўшы,
аб сонцы пакінуўшы песню...
Выпаў лёс нам такі —
сеяць зерне сваё на каменне.
Выпаў лёс нам такі —
камянець у гарачай слязе.
Толькі ў глебе глухой
родных думак глыбела карэнне,
Каб, нарэшце, пад новы пасеў
зварушыць, апрытоміць яе!
Лёс такі выпаў нам —
сеяць ніву сваю безупынку,
Шнур спрадвечны цягнуць,
мужным сэрцам сваім не слабець!
Покуль сонца ўгары,
ў вечнай працы шукай паратунку:
Выпаў лёс нам такі —
пра сябе забываць у сяўбе...

***

У. А. Калесніку
Даў сэрца Бог
Гарачае, як сонца!
Як сталь — гартоўнае
І мяккае, бы воск...
А сам пайшоў
У спраў сваіх бясконцасць,
Каб я спакойна
Ў свеце жыць не мог!..
Не даручыў
Ніякіх абавязкаў...
Сказаў адно:
Жыві з сваёй душы!..
І я пайшоў
Дарогай гэтай цяжкай,
Як ён... Свой крыж
Па свеце валачыць!..

***

I

Хвіліны, быццам кроплі дажджу,
Што падаюць і разбіваюцца
Аб жорсткі асфальт...
Не крычы ад непазбежнасці —
Праз гэта праходзяць усе...

II

Па размытых дарогах
Аўтамабілі бягуць бясконца...
Час ад часу яны прыпыняюцца
Перад крыжамі вуліц,
Суцішваюцца на імгненне, —
Каб назаўсёды
Знікнуць у вечнасці...

III

Ты пераступіш і цераз гэты
парог...
І дзверы ў тваё мінулае
Адчыняць людзі.
Добра, калі яны зразумеюць
У табе чалавека, —
Тады ты атрымаеш у спадчыну
Самога сябе...

IV

Выпраўляючы ў свет,
Бацькі не змаглі табе даць нічога,
Акрамя ўласнай любові...
Але гэтага табе хапіла
На ўсё жыццё...

***

Мама! Ты мыла падлогу,
І рукі, патрэсканыя ад марозу,
Снавалі туды і сюды...
Ты мыла падлогу —
Здавалася, мыла дарогу,
Каб дзеці
па чыстай дарозе ішлі!

Я іду, мая мама,
Шмат дзён і начэй...
Толькі сонца
Паўсвету абыходзіць хутчэй!
Яно падае ноччу,
У знямозе, без сіл
За круты, быццам лоб,
Небасхіл.

І спяшаюся я
З ім зраўняцца да дня...
І пасецца ў начным
Думак вольных сям'я.

Ты са мной у дарозе...
Хоць стаіш на парозе,
За які я пайшоў!
Развятрыліся пасмы
сівых валасоў...
І глядзіш ты сляпымі вачыма
ў прастору:
Дзе ў бязмежнасці гэткай
Знайшоў сын апору,
Дзе ён сілы знайшоў?

***

Пазамятала снегам
сцежкі-дарожкі...
Ці дачакаешся, мілая,
канька варанога,
Конніка ўдалога?
Не князя і не стражніка,
Не кніжніка і не бражніка,
Не злога апрычніка
І не начальніка сталічнага...
А такога малойчыка ўдалога,
Каб ляцець за ім у град
і ў сцюжу,
Рук гарачых не расплятаючы,
Вуснаў салодкіх
не размыкаючы...
Ці дачакаешся?
Пайшлі вятры языкатыя,
злыя
Пад вароты крупу калючую
белую сеяць,
На пустой мякіне варажыць...
Ой, тужыць дзеўцы краснай,
тужыць!
Ой, глядзець у акенца,
глядзець...
Зіму лютую праклінаючы,
Сонца яснага выглядаючы!..

***

Чалавек ад пяра!..
Ён усяму навучыўся
Ў нашай цудоўнай краіне:
Печы класці, араць,
Лес у пушчах халодных валіць...
А як што...
Божа мой!
Такую традыцыю маем...
Трэба будзе ў Дубоўкі
Сякеркі адно папрасіць!

***

Гэтая страшная мера спакою!..
Што будзе з табою,
Што будзе са мною?
Дрэва засохла, не хоча расці,
Дзеці ў школу не хочуць ісці.

Гэтая страшная мера спакою...
Хоць на міг заспакойся —
І мы знікнем з табою.

Дзікая груша будзе цвісці,
Дзікая груша будзе цвісці,
Дзічка ў полі стане расці!
Дзеці ў школу не хочуць ісці...

***

Перачытаю ўчарашнія газеты,
Пайду праз сквер пусты —
Па хлеб і цыгарэты...
Дарогу, як сляпы,
Прабуючы кійком,
За вугал завярну —
Па малако.
Каб там чакаць,
Ці скора прывязуць...
Пасля з сябрамі
гары той глынуць...
Каб дома, у цішы,
Дзе слёз ніхто не ўбачыць,
Расплакацца ў душы
На гэткі лёс сабачы!..

***

Дзядзька памёр.
Памерла цётка...
Так і жывём —
Горка і проста.

Ды каб жылі ж хоць?
Век свой зжываем!..
Бо не жывём мы,
А дажываем!..

К нашым рукам
Прыліпла работа,
А без работы
Жыць неахвота...

Рана па ране,
Іван па Іване...
Прадзедаў доўгія
Доўжым курганы!...

Згінулі волаты,
Рэшта — драбнота...
Дзесяць мільёнаў
Чакаюць Пол Пота!..

***

На Дрэве Жыцця замірае
зялёнае лісцейка,
Мы забылі імёны птушак,
раслінаў і дрэў...
У краіне, засыпанай цэзіем,
З намі адно засталіся
шэры кот ды сабака,
Ды ўцёклы з вайны чэчэн...

Кот таму, што з пароды
рысінай здрабнеў
І стаў паляваць ленавацца.
А сабака таму, што, як праўды,
баіцца ваўка!
А чэчэны таму, што нікога
даўно не баяцца,
Толькі стрэльбы хапаюць,
Як згледзяць сляды русака!..

На Дрэве Жыцця замірае
зялёнае лісцейка...
Мы забыліся назвы птушак,
звяроў і раслін.
У краіне, засыпанай цэзіем,
З намі адно засталіся
кот Матроскін
ды Шарык...
А хлопчык пайшоў ў магазін...

***

Дзякуй, восень, табе,
Што была залатая,
Што не зналася з золлю
І ніцай слатой...
Сярод тых, што прайшлі,
Ты, адзіная, знала,
Як у брудзе жыцця
Быць прыгожай такой.

Дзякуй, восень, табе
За нябёсаў блакіты,
За няспешную мудрасць
І дум вышыню...
Сярод зім урачыстых
І вёснаў высокіх
Я цябе,
Як апошнюю радасць,
Люблю!..

Народная Воля
http://www.nv-online.info
17—19 САКАВІКА 2009 г.

КНІГАПІС

Праўда Сяргея Законнікава

"Насустрач" — пад такой назвай выйшла кніга публіцыстыкі і эсэ паэта Сяргея Законнікава **(Выдавецтва Зміцера Коласа, 2008)**, вядомага не толькі сваімі вершамі, але і грамадзянска-акрылёнымі выступамі на старонках незалежнага друку.

"Насустрач" — гэта нераўнадушныя роздумы над беларускай гісторыяй і сучаснасцю, асветленыя вопытам развіцця еўрапейскіх дэмакратычных краін. Гэта асветніцкі лемантар, які мусіць яднаць нацыянальнае і павышаць грамадзянскую актыўнасць.

«Ген жыцця»

Народны мастак Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Васіль Шаранговіч апублікаваў аўтабіяграфічную аповесць **(выдавецтва "Кнігазбор", 2009)**. "Гэта кніга — споведзь, праўда жыцця аднаго чалавека, у якім адбілася цэлая эпоха, пра якую ён можа сведчыць сваімі асабістымі ўражаннямі і прыкладамі, — прызнаўся ў "Гене жыцця" аўтар.

«Рабінавы хмель»

Упершыню ў Беларусі выйшла кніга выбраных твораў беларускага паэта, публіцыста, выдаўца і палітыка Сяргея Хмары (1905—1992), які быў вымушаны з 1944 года жыць у эміграцыі **(выдавецтва "Кнігазбор", 2009)**.

Выбранае адкрывае чытачу амаль невядомую атлантыду хмараўскіх вершаў 1930—1980-х гадоў, празаічныя абразкі, нарысы з беларускай міфалогіі "Аб багох крывіцкіх сказы", згадкі-ўспаміны С.Хмары пра Антона Луцкевіча, Ігната Дварчаніна, Піліпа Пестрака, Янку Станкевіча і іншых дзеячаў беларушчыны, "Кароткія даныя аб сабе" і ягоныя лісты з далёкага Таронта.

Укладанне і каментары, а таксама прадмову да кнігі зрабіў пісьменнік і слонімскі культурніцкі руплівец Сяргей Чыгрын.

НАШ ГОСЦЬ

Сакрат ЯНОВІЧ:

«Крынкі — мой цэлы свет...»

Беларускі пісьменнік Польшчы Сакрат Яновіч — не часты госць метрапольных выданняў. Апошні раз давялося сустрэцца з ім на юбілеі "Нівы" два гады таму. Там мы спрачаліся пра Янку Купалу...

На 50-годдзі літаратурнага аб'яднання "Белавежа" з ім зноў пабачыўся. Гэтым разам мы гутарылі пра ўсё: палітыку, літаратуру, жыццё і г.д. З дазволу спадара Яновіча ўключыў дыктафон і сёе-тое занатаваў. Некаторыя фрагменты гутаркі прапаную "Літаратурнай Беларусі".

Сяргей ЧЫГРЫН



— Спадар Яновіч, скажыце, калі ласка, чаму вашыя бацькі далі вам такое рэдкае імя — Сакрат? Можа, гэта ў гонар старажытнагрэчаскага філосафа Сакрата? Ці ведалі вашы бацькі пра грэчаскую філасофію?

— Гэта мяне маці так назвала. Яна была ў бежанстве ў Расіі за Самараю. Там пэўны час хадзіла ў расійскую школу. І аднойчы яе настаўніца пасадзіла са сваім сынам за адну парту. А таго сына звалі Сакрат. Мама дрэнна вымаўляла словы па-расійску, дык ёй заўсёды дапамагаў сын настаўніцы. І калі мае бацькі вярнуліся з тае няшчаснае Расіі на Радзіму, і калі мама выйшла замуж і нарадзіўся я, то яна заўпарцілася і ахрысціла мяне Сакратам. Хаця яна зусім не разумела і не ведала пра Сакрата нічога. Але ў яе памяці заўсёды быў той расійскі хлопчык Сакрат.

— А бацька не быў супраць, каб яго сын насіў такое імя?

— А бацька ўвогуле не ведаў, у чым справа. Ды яго гэта мала цікавіла. Як назвала жонка — так і добра.

— А ў школе з вас не смяяліся?

— Спачатку смяяліся, бо не разумелі майго імя. Называлі мяне — крот. Але аднойчы святар Антон Савіч у сваёй пропаведзі згадаў, што быў такі грэчаскі філосаф, які пацвердзіў, што чалавек мае душу, што мудрасць — аснова высокамаральных учынкаў. Тады ўсе ад мяне адсталі.

— А цяпер вы, мабыць, з гонарам носіце імя Сакрата? Дый гучыць — Сакрат Яновіч! А ні Юрка Яновіч ці Міхась Яновіч...

— Пэўна так! Бо гэта імя не штодзённае. Дый Юркаў і Міхасёў цэлыя копы, а Сакрат у Беларусі адзін.

— Вы казалі, што маеце ўжо ўнучку і ўнука. А на якой мове вы з імі размаўляеце? І ці ведаюць яны родную мову?

— Я маю двух сыноў і двух унукаў, і дзве ўнучкі. Сыны выключна добра размаўляюць па-беларуску. Унучка, якая жыве са мною, паступае так: калі ёй трэба грошы і хоча да мяне падлашчыцца, гутарыць са мной па-беларуску, размаўляе на роднай мове, а калі спрачаецца са мной, то па-польску.

— Спадар Сакрат, вы напісалі і выдалі шмат добрых кніг. Які ўплыў на вашую творчасць аказала літаб'яднанне "Белавежа"? І наогул, што дала вам "Белавежа"?

— "Белавежа" дала мне шмат, дзякуючы Георгію Валкавыцкаму, першаму кіраўніку. Ён на пачатку існавання аб'яднання быў адзіным чалавекам, які добра арыентаваўся ў літаратуры. А я меў тэхнічную адукацыю, я — электратэхнік. Але дзякуючы Валкавыцкаму і майму швагру, які некалі прывёз кніжку Бабеля на польскай мове, я стаў пісьменнікам. Я прачытаў кнігу Бабеля з цікавасцю. Валкавыцкі даў паняцце, што такое *літаратура*, а Бабель паказаў мне, што можна пісаць не пад Пушкіна, не пад Міцкевіча, а пад маё мястэчка Крынкі.

Крынкі — гэта мой свет. Крынкі для мяне — адкрыццё. Крынкі — адкрыццё вялікай гісторыі. Гэта могілкі: каталіцкія, праваслаўныя, жыдоўскія, нямецкія. Цяпер мне зразумела, чаму мой дзед умеў размаўляць на пяці мовах, хоць сам не ведаў нават літар. Але ён чуў гэтыя мовы, таму і навучыўся на іх гаварыць.

— З Крынак быў родам Янка Геніюш — муж Ларысы Геніюш. Ды і род Ларысы Міклашэвіч (Геніюш) паходзіць таксама з Крынак. Вы кантактаваліся з Ларысай Геніюш?

— Я двойчы з ёю сустракаўся. Першы раз, дзякуючы Аляксею Карпюку з Гродна, мы наведалі ў Зэльве Ларысу і Янку Геніюшаў. А пасля яна была тут у Беластоку ў сына, дзе мы таксама мелі сустрэчу.

— Аб чым вы гутарылі?

— Гэта была такая гутарка трагічная. Бо яе жыццё было трагічным... У Беласток яна прывезла мне стэнаграму выступлення Аляксея Карпюка на V з'ездзе Саюза пісьменнікаў БССР у Мінску 13 мая 1966 года. Паэтка была ўзрушана гэтым выступленнем. І я напісаў ліст Аляксею, выказаў сваю згоду з яго меркаваннямі і падтрымку. Але ж Аляксей Карпюк быў наіўным чалавекам і пачаў гэтым пісьмом хваліцца, што, маўляў, малады аўтар з Беласточчыны падтрымлівае яго. І тады зацікавілася мною савецкае КДБ. І я з-за гэтага страціў працу, быў беспрацоўным. Але мне шмат дапамагалі палякі.

— Калі мы згадалі сына Ларысы Геніюш — Юрку, дык скажыце, калі ласка, пра вашыя агульныя творчыя ўзаемаадносіны. Вы некалі разам выдавалі кнігі п'ес. Так?

— Было такое. Бо Юрка Геніюш у Беластоку жыў са мною побач. А я ў Беластоку пражыў 50 гадоў. Пазнаёміліся мы праз тыднёвік "Ніва", я працаваў журналістам, а ён туды часта заходзіў.

— А з Валянцінай Геніюш — жонкай Юркі Геніюша і іх сынамі вы сёння кантактуеце?

— Не, на жаль. Яны цяпер жывуць у іншым свеце з іншымі інтарэсамі і справамі. Дый я ўжо ў Беластоку не жыву, а ў Крынках.

— Спадар Сакрат, і чым вы зараз займаецеся ў сваіх Крынках?

— Я найперш ратуюся ад смерці, бо моцна хварэю. А яшчэ пішу. Пішу вельмі марудна. Але пішу прозу і вяду свае дзённікі. Бо заўважыў, што дзённікаў ніхто не піша. Нашае сялянскае асяроддзе не любіць пісаць дзённікаў.

— І што вам дае напісанне дзённікаў?

— Я запісваю факты, якія адбываліся і адбываюцца цяпер, і яны хутка знікнуць, і пра іх ніхто не будзе нічога ведаць. А для нашчадкаў жыццёвыя факты трэба захаваць.

— Янка Брыль пакінуў багатыя і цікавыя дзённікі — з запаветам, каб апублікавалі іх праз 5 гадоў...

— Я не чуў пра гэта... Але калі тое праўда, то яна вельмі добра сведчыць пра Янку Брыля, бо дзённікаў у нас пераважна не пішуць, таму што беларуская літаратура — гэта літаратура мужыкоў, а мужыкі гэтым не займаюцца. Дзённікі пішуць людзі горада...

Акрамя пісьменства штогод арганізоўваю "Беларускі дыялог". Бо я заўважыў, што цяпер лёгка выдаваць штогоднік для Еўропы. У Еўропе ёсць людзі, якія цікавяцца беларускай літаратурай. І я дзесяты год выдаю "Год беларускі" на мовах Еўропы. Гэта значыць, штогадовы том, які выходзіць па прынцыпе: беларуская літаратура на мовах Еўропы, а еўрапейская літаратура — на беларускай. Справа ў тым, што нашу літаратуру трэба еўрапеізаваць. Яна ўвесь час з'яўлялася філіяй расійскай, а гэта так не павінна быць. Ды і расійская літаратура ўзнікла пад уплывам еўрапейскай. Скажам, каб зразумець Пушкіна, трэба ведаць французскую літаратуру. Калі яе не ведаеш, то Пушкіна дасканала не зразумееш. Бо Пушкін рос у асяроддзі французскай культуры. Яго маці ненавідзела расійскую мову. Яна Сашу Пушкіна, калі ён размаўляў па-расійску, нават біла! І напачатку ён пісаў выключна па-французску. Але хто аб гэтым сёння і пры бальшавіках казаў? Ніхто... У Савецкім Саюзе пераважаў расійскі шавінізм...

— Які працягваецца да сённяшніх дзён...

— Так. Дык я сабе падумаў, што для Еўропы, пры сённяшніх тэхналогіях, штогоднік можна выдаваць нават у гумне.

— Правінцыі сёння не існуе?

— Што Крынкі, што Варшава — усюды можна выдаваць добрыя і неабходныя кнігі. А тым больш пра Беларусь для Еўропы. Сёння ў Беларусі неабходна выдаваць літаратурны часопіс для Еўропы, каб нас чыталі, каб пра нас ведалі, каб прапагандаваць нашу літаратуру, каб беларуская літаратура знаходзіла сваё месца ў Еўропе.

— Тым больш нам ёсць што даць пачытаць еўрапейскаму чытачу. А вы, спадар Сакрат, што чытаеце, перачытваеце з беларускай літаратуры?

— Я чытаю і перачытваю Максіма Багдановіча. Пасля люблю чытаць геніяльнага паэта Уладзіміра Жылку, а таксама зачытваюся мініяцюрамі Янкі Брыля. Вельмі люблю чытаць прозу Змітрака Бядулі.

З сённяшняй літаратуры мне даспадобы творчасць Уладзіміра Някляева, Дануты Бічэль, Лявона Баршчэўскага... А з прозы кагосьці назваць пасля Васіля Быкава я нават і не асмелюся. Пасля Васіля Быкава ў нас доўгадоўга не будзе роўнага яму. Бо гэта зусім іншае майстэрства. Ён меў літаратурны інстынкт, вялікі талент.

— Якія планы ў 72-гадовага Сакрата?

— Рыхтую дзесяты том "Году беларускага". І спадзяюся яшчэ некалькі падрыхтаваць і выдаць, бо, дзякаваць Богу, палякі мне дапамагаюць. З палякамі лёгка гутарыць, дамовіцца пра канкрэтную справу, а вось з беларусамі — цяжка. Палякі цяпер выдаюць цэлую бібліятэку беларускай літаратуры, а з боку ўладнасавецкай Беларусі ідзе толькі хамства... На вялікі жаль...

ЭСЭ

Віктар КАЗЬКО

«Так пачынаецца балванізацыя»



На пачатку дваццатага стагоддзя ў гемафільна-блакітную немачную кроў уладароў улілі кроў свежую, хаця і больш подлага, вяскова-пралетарскага паходжання. І гэтае зліццё, помесь крыві, спарадзіла мешанцаў. Гармоніі не атрымалася. Мешанцы адчулі дзікі сверб. Наследны сверб, што сыходзіў ад шапкі Манамаха: галава ў Сенькі, што ўхапіў яе, аказалася не па шапцы...

І, здаецца, на стагоддзі адладжаныя сістэмы пачалі бурыцца. Не толькі і зусім не таму, што заржавелі, прагнілі ад крыві, а з-за адсутнасці сістэмы. Сістэмы, якая б здолела трымаць дурня-правадыра ў лейцах. З-за адсутнасці адчування і разумення народу, краіны — дзяржаўнасці. Боскага прызначэння ўлады. І гэта хвароба, гэта з'ява сёння — планетарная. Хаця кожны раз праяўляецца па-новаму.

— Россия, ты одурела! — выгукнуў некалі вядомы савецкі філосаф і літаратуразнаўца Юрый Каракін. Тады гэта падалося абразай. Але, як высветлілася значна пазней і сёння яшчэ працягвае высвятляцца, — то было папярэджанне.

Адурэла не толькі Расія. Адурнеў увесь свет, нашае жыццё... Уражанне, што недзе падчас мо землятрусу ці іншага стыхійнага бедства, выбуху чацвёртага блоку чарнобыльскай атамнай станцыі разам з вогненнай лавай, попелам і тлом на святло Божае з пекла выхапілася столькі аднойчы пахаваных ужо, непатрэбных свету людзей, што яшчэ пры першым нараджэнні былі абвешчаныя як найвялікшыя злачынцы сусвету і заяўленыя ў касмічны вышук. І ўсе гэтыя колішнія злачынцы, як мышы, папаўзлі не пад венік, а да ўлады. Пішчом пашыліся да трону зямнога. І, карыстаючыся імгненнем, пакуль творцы, Зямля і людзі не спахапіліся, — гадзяць, гідзяць, гнюсяць.

Маленькі, шэры, шараговы чалавечак, што выйшаў на арбіту, дарваўся да ўлады, больш за ўсё баіцца, каб яго не засцілі, не засланілі: сонца павінна быць відно з усіх бакоў. Наш Цэзар вышэй за ўсіх іншых Цэзараў. І таму, калі нестае магчымасці свяціць з вышыні, калі німб вакол галавы больш смярдзіць, чымсьці ззяе, і не хапае, не хапае росту, каб падвысіцца, хаця б параўнацца з высокімі — выйсце адно: падкараціць гэта высокае, падагнаць усіх астатніх хаця б пад свой памер, розум і рост.

Так пачынаецца балванізацыя. І што самае страшнае — балванізацыя не народу цяпер ужо, бо, як кажуць, розум нікуды не дзенеш. Асабістая балванізацыя ўлады і ўладара ў іх імкненне "держать и не пущать", адсачыць і прадухіліць усе спробы народу падняцца з каленяў і стаць людзьмі.

Так зводзяць на нішто, апускаюць адразу ўвесь народ, зводзячы яго да свайго ўзроўню, свайго інтэлекту. А каб безумоўна ўжо дамагчыся гэтага, трэба той народ справакаваць яшчэ да нейкага відавочнага, а лепш яшчэ і пачварнага глупства. І распачаць з тым глупствам, а заадно ўжо і з народам змаганне, каб даць народу сцяг, а гэта значыць самога сябе. І вось тады і толькі тады можна адчуць сябе Месіяй.

Старыя і крывавыя мроі і трызненні вялікіх правадыроў усіх часоў і народаў. Але, пэўна, толькі цяпер гэ-тая закарэлая паранойя і шызафрэнія пачынаюць здзяйс-няцца. І за гэтым, калі меркаваць па тым, што адбываецца, творыцца вакол культуры, навокал чалавека — вялікая будучыня. Чалавецтва падрыхтаванае ўжо выканаць спрадвечную мару правадыроў. Уладзе, узрошчанай сучасным тэлебачаннем, затлуміла галаву бязглуздае адчуванне ўсёдазволенасці і беспакаранасці, чаго, дарэчы, прагне, жадае і народ, седзячы на дзяржаўнай наркаце, перад тэлевізарам. Збылася нарэшце векавая мара чалавецтва аб роўнасці. Душы не чутно. Народ і ўлада гатовыя зліцца ва ўзаемным экстазе...

Чалавек, жывучы ў атачэнні сабе падобных, абуджае так званую, усюды рэкламуемую сёння жыццяздольнасць, амаль першабытную прадпрымальнасць і практычнасць. І тут я вымушаны прызнацца, калі быць шчырым, чымсьці так жыць — лепей, прывабней самому перакінуцца ў ваўка, набыць волю і свабоду. Каб стаць самім сабой — самому пайсці ў пярэваратні. Мо яны нас куды-небудзь ды ўсё ж выведуць — прывядуць да чалавека.

А ў пярэваратні нас вядуць сёння ўсе. Да гэтага нас падштурхоўваюць нашыя поспехі і дасягненні апошняга часу: эканамічныя, спартыўныя, а найбольш культурныя, прапагандуемае сёння мысленне, мастацтва, слова і, вядома ж, кніжка. Канчатковая духоўная прадукцыя народу і краіны, спажыўцамі якой мы з'яўляемся. Спа-жыўцамі і мімаволі вытворцамі. Творцамі. У адным з вясковых магазінаў, уражаны вядзьмарскім шабашам, я запытаў у прадаўца:

— А проста пачытаць у вас хоць што-небудзь ёсць? Не, нават не на беларускай мове. Хай будзе хоць на кітайскай, якой я не разумею.

— Вы думаеце, нам самім з гэтым падабаецца з дня ў дзень стаяць? Секс, секс і сатанізм. Няма нічога больш і на базе. Бяром і распаўсюджваем, што даюць, што ёсць.

Тое ж самае амаль слова ў слова мне адказалі пра-даўцы кнігарні ў горадзе і ў кніжным кіёску на аўтобуснай станцыі ў раённым цэнтры.

І хай не хлусяць сённяшнія новаспечаныя ідэолагі, дойліды беларускай культуры, рупліўцы матчынай мовы, хай не хлусяць, што на беларускую кніжку ну зусім няма попыту. На туалетную паперу ў савецкага народу таксама не было попыту. Ці ж можа быць ён на тое, чаго няма ў прыродзе? Што можна ўзяць і прынесці ў хату з могілак? Беларускую кніжку звялі на нішто. Ідзе вялікае і радаснае чаканне, калі сканае апошні беларускі пісьменнік. І адыход іх, іх выміранне пачаліся ўжо...

Так, пэўна, непрыкметна ў свой час выміралі маманты. Але, у адрозненне ад нас, яны вялікія і кашлатыя. І біўні яшчэ маюць, каб прабіцца праз тысячагоддзі. Здольныя праламаць час, праляжаць у зямлі да таго, як спрахнуць, не адну эпоху. А ў чалавека, хоць ён і пісьменнік, зубоў тых, клыкоў і на яго век не хапае...

Пісьменнік у нашыя дні безабаронны, абрабаваны і голы духоўна і матэрыяльна. Раней у яго была магчымасць працы хоць бы ў стол у спадзяванні, што яго ўсё ж пачуюць калі-небудзь і прачытаюць. Сёння адабрана і гэта. Сёння патрэбнасць і разгул іншага роду літаратуры і мастацтва, мастацтва і інтрыгі па-літычнай, парламенцкай, чырвона-карычневых і белапен-ных прыбояў. Бязглуздзіца, нескладуха і лухта з высо-кіх трыбун...

Для чытання і адцягнення ад бяссоніцы запаланіўшая не толькі Беларусь, а ўсю адну шостую сушы, кніга, увесь змест якой ужо на вокладцы: голая задніца. Для роздуму, работы розуму і сэрца — напоўшызафрэнічнае трызненне з экрана тэлевізара народных абраннікаў. І камусьці ўсё ж, на мой погляд, гэта трэба, вельмі трэба. І менавіта гэтая бессэнсоўнасць вядзе да фашызму, гэта і ёсць фашызм духоўны, а не гульня ў яго некалькіх хлапчукоў. Глеба для фашызму — пастсавецкі булёнчык, які гатуюць сёння тыя, хто прыйшоў да ўлады, хто з аднолькавай лёгкасцю пакланяўся ўчора светлай будучыні чалавецтва, а сёння — рублю і долару. Менавіта таму так глыбока задуменны наш парламент, калі вырашаецца пытанне аб дзяржаўнай мове: ужо лепш японская, чым родная, беларуская, бо многія з тых, хто сядзіць там, па сваёй прыродзе дзвюхмоўны, двухаблічны. У наяўнасці па-ранейшаму адмаўленне ад сябе, свайго народа і сваёй гісторыі.

І таму, відаць, у нашай беларускай літаратуры такое глухое безнадзейнае маўчанне. Стары язык яе вырваны, адпала вуха, што слухае наш ранейшы голас. І мы нямыя. Нам бы каму-небудзь зноў прадацца. У зону нам хочацца, хутчэй назад, у зону рублёвую, доларавую, любую, была б толькі цвёрдая рука, хоць з таго свету. І гэта не толькі нашае жаданне, такі стан нашага грамадства сёння.

...Страх. Чорны страх ахутаў і пакаціўся па зямлі, па нашых гарадах і вёсках, душах і галовах. Ці не страх кіруе сёння светам, усім нашым грамадствам? Узгадайце толькі дзве вялікія перамогі апошніх гадоў: *элегантную і ошеломительную*.

За імі найвялікшая наша бяда: чорны страх тых, хто ладзіў гэтыя перамогі, страх страціць работу і ў лепшым выпадку апынуцца на вуліцы. А не ў лепшым? Спытайцеся ў Віктара Ганчара з Юрыем Захаранкам...

Рытуальна-пахавальная каманда матчынай мовы, маладыя бычкі, пастроеныя ў шарэнгі бацькамі-камандзірамі, атрымалі загад і спяшаюцца яго выканаць, спадзеючыся, што, мо, некалі яны самі стануць даярамі...

Няма, няма міру ў дваццаць першым стагоддзі ў сталіцах. Няма міру і ў рэзервацыях.

І ў шыкоўных кнігарнях, у якіх жывуць і плодзяцца нават залатыя рыбкі, у кнігарнях усцяж аўтабанаў — галоўных праспектаў стольнага горада і занядбаных, заседжаных мышамі і мухамі крамах забытых Богам вёсак наладжаныя, падрыхтаваныя труны для забітай, засіленай, згвалтаванай мовы. Тваёй і маёй. Як жабрачка на амбоне з працягнутай рукой стаіць, а хутчэй ляжыць там беларуская кніжка. Кніжка на першай і апошняй, амаль не існуючай, памерлай сёння на Беларусі дзяржаўнай мове...

Ад "Ь": *Гэтую публікацыю склалі фрагменты эсэ "Час пярэваратня..." і "Паміж цюленем і акрабатам". Саюз беларускіх пісьменнікаў у серыі "Кнігарня пісьменніка" неўзабаве выдасць новую кнігу эсэ і публіцыстыкі лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Віктара Казько.*

КНІГАПІС

Літаратурнае Прыдзвінне

Выйшаў з друку рэгіянальны паэтычны зборнік "Ад ніў прыдзвінскіх" **(выдавецтва "Логвінаў")**. Ён створаны намаганнямі Віцебскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў. Першая афіцыйная сустрэча кнігі з чытачом адбылася ў Літаратурным музеі Віцебска 15 сакавіка.

Раней у Віцебску перыядычна выдаваўся літаратурны альманах "Дзьвіна". Літаратурныя альманахі і анталогіі выдаюцца таксама на Брэстчыне ("Жырандоля"), Гомельшчыне ("Святло шчымлівай памяці"), Баранавічах ("Святліца"), Наваполацку, Горках і некаторых іншых гарадах.

С.С.

«Кнігарня пісьменніка» незалежнага СП

"Кнігарня пісьменніка" — пад такой назвай Саюз беларускіх пісьменнікаў вырашыў запачаткаваць сваю выдавецкую серыю. У ёй пабачаць свет кнігі тых літаратараў, якіх не друкуюць дзяржаўныя выдавецтвы.

"Наша найстарэйшая творчая арганізацыя Беларусі раней мела ўплыў і на адпаведныя профільныя міністэрствы, і на літаратурнае выдавецтва "Мастацкая літаратура", мела сваю кнігарню, — распавёў старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў **Алесь Пашкевіч**. — На сёння Саюз такога не мае. Таму было вырашана запачаткаваць сваю кніжную серыю, каб быць не толькі стваральнікамі літаратурных тэкстаў, але і стаць пасрэднікам паміж аўтарам і друкарскім варштатам".

Першыя тамы "Кнігарні пісьменніка" падрыхтаваныя ўжо да друку: кніга прозы **Уладзіміра Някляева** "Цэнтр Еўропы", зборнік эсэ **Віктара Казько**, кніга выбраных перакладаў **Ніны Мацяш** і "Анталогія сучаснай маладой жаночай прозы".